Источник: **«Звязда» - 2012-08-04**

## "Ён быў слугой багіні шахмат..."

Некалькі абзацаў у працяг дакументальнага аповеду пра майго бацьку Г.М. Верасава

**Апошнім часам брэндавы від спорту — футбол. А вось у 30-я гады мінулага стагоддзя гэткім жа брэндавым відам з'яўляліся шахматы. Ва ўяўленні многіх людзей умельства добра гуляць у шахматы сведчылі найперш пра інтэлект і ўзровень культуры чалавека. У перадваенныя часы краіна Саветаў перажывала сапраўдны шахматны бум. Старажытнай гульнёй бавіліся ўсе: ад школьнікаў і студэнтаў да чыноўнікаў і военачальнікаў. Шахматныя чэмпіянаты Саюза збіралі масавыя аўдыторыі. Па радыё рэгулярна вялі рэпартажы аб гэтых турнірах і да пачатку трансляцый спяшаліся дадому гэтак жа шпарка, як сёння спяшаюцца балельшчыкі да паказу ў прамым тэлеэфіры спаборніцтваў з арэн Алімпіяды-2012 у Лондане.**

Мой бацька гэтаксама стаў сталым удзельнікам буйных шахматных турніраў. Хаця меў усяго толькі першую катэгорыю (было яму тады 22 гады). Аднак ужо ў першым прэстыжным чэмпіянаце СССР 1934 года бацька выклікаў фурор — атрымаў 9 перамог без адзінага мірнага пагаднення (выпадак унікальны!), і адразу яго імя стала вядомым на ўвесь Саюз.

Гаўрыла Мікалаевіч быў чалавекам сціплым: я ведаў пра бацькавы дасягненні ў шахматных дуэлях з вядомымі гросмайстрамі і майстрамі, а вось пра грамадскі рэзананс ягоных даваенных поспехаў даведаўся пазней. Напрыканцы 1970-х, калі ён мужна змагаўся з цяжкай хваробай, дырэктар анкалагічнага Інстытута імя Герцана ў Маскве акадэмік Паўлаў падчас абследавання сказаў бацьку: "Гаўрыла Мікалаевіч, а ваша прозвішча перад вайной без перабольшвання грымела ў асяродку знаўцаў шахматнай гульні на абсягах Саюза ССР..."

На фронце, у 1942 годзе, бацька быў цяжка паранены, і камандзір вайсковай часці паставіў подпіс пад пахаванкай: "Гаўрыла Верасаў загінуў..." Аднак здарыўся цуд — бацька застаўся жывым... Вайна ж, па сутнасці, паставіла крыж на магчыма зорнай кар'еры самабытнага шахматыста, але ў той жа час дала штуршок у іншым напрамку: пасля вайны, пасля працы ў Міністэрстве замежных спраў БССР і вучобы ў Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС кандыдата гістарычны навук Гаўрылу Мікалаевіча прызначаюць на пасаду старшыні праўлення Беларускага таварыства культурнай сувязі з заграніцай, дзе ён працаваў з 1952-га па 1958 год. На гэтай адказнай пасадзе дысцыплінаваны, прывучаны шахматамі да свабоды ў творчасці, да пошуку і прыняцця нестандартных рашэнняў, бацька ў асяродку чыноўнікаў, як мне здаецца, адчуваў сябе не вельмі камфортна. Затое яго заўсёды вабілі стасункі з людзьмі творчымі, таленавітымі, карацей, з асобамі выдатнымі. У асяродку яго сяброў былі пісьменнікі Іван Стаднюк, Іван Шамякін, паэты Аркадзь Куляшоў, Максім Лужанін, драматург Андрэй Макаёнак, скульптары Заір Азгур і Андрэй Бэмбель, мастак Зянон Паўлоўскі, акцёр тэатра і кіно Раман Філіпаў, акадэмікі Фёдар Канстанцінаў і Яўген Канавалаў.

Дзе б бацька ні працаваў, якімі грамадскімі справамі ні быў заняты, кожную вольную хвіліну ён прысвячаў шахматам. І ўвогуле яго немагчыма было застаць, каб нічога не рабіў. Здаралася (я таму сведка), бацька да світання аналізаваў шахматныя партыі, чытаў энцыклапедыі, даведнікі. Захапляўся і добра ведаў літаратуру, айчынную і замежную (гэта, у прыватнасці, былі творы з яго любімых часопісаў "Новый мир", "Иностранная литература", "Современник", "Юность", "Неман", "Наука и жизнь", шмат

чытаў кніг і перыёдыкі на польскай мове) і, як мне падаецца, аддаваў перавагу творам глыбокім, з філасофскім падтэкстам.

У сярэдзіне сямідзясятых гадоў бацька прымаў удзел у турнірах ужо калі-нікалі, аддаваў перавагу шахматнай аналітыцы. Праанализаваўшы сотні партый, згуляных у розныя гады вядомымі шахматыстамі свету, Гаўрыла Мікалаевіч прыйшоў да высновы, што тыя ці іншыя перамогі нават такіх легендарных гросмайстраў, як Р. Фішар, М. Таль, А. Карпаў, — вынік... памылак іх сапернікаў. А гэтая акалічнасць падказала яму звярнуць увагу на феномен, які можна назваць "практычнай бясконцасцю шахмат пры іх тэарэтычнай канчатковасці". Магчыма, я памыляюся, але мой бацька першым агучыў ідэю пра стварэнне навукі аб памылках з дапамогай шахмат, якія знаходзяцца на памежжы канечнага і бясконцага. Як і само жыццё...

**P.S.** *28 ліпеня споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Гаўрылы Мікалаевіча Верасава — беларускага шахматыста і грамадскага дзеяча. Пасля яго адыходу ў іншы свет мінула амаль 33 гады. Тэрмін дастатковы, каб забыць чалавека. Але, як высветлілася, яго памятаюць вучні-шахматысты верасаўскай школы. Гэта сведчыць аб тым, што сваё жыццё ён пражыў яскрава і годна.*

*Карыстаючыся нагодай, мне хацелася б падзякаваць усім, хто адгукнуўся з нагоды юбілейнай для нашай сям'і даты, за светлую памяць пра бацьку. Лічу сваім абавязкам падзякаваць таксама рэдкалегіі газеты "Звязда", у якой бацька працаваў у даваенныя гады ў якасці літаратурнага супрацоўніка, за прадастаўленне старонкі для публікацыі дакументальнага аповеду пра жыццёвы і творчы шлях Гаўрылы Мікалаевіча.*

**Валерый ВЕРАСАЎ, галоўны навуковы супрацоўнік інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі, доктар біялагічных навук**